УДК 94 (476) «1921/1939»

# РЭЛІГІЙНАЕ ПЫТАННЕ Ў ІДЭАЛОГІІ ПРАЎРАДАВЫХ СТУДЭНЦКІХ САЮЗАЎ МІЖВАЕННАЙ ПОЛЬСКАЙ ДЗЯРЖАВЫ

**Крывуць Віталій Іванавіч**
БІП – Універсітэт права і сацыяльна-інфармацыйных тэхналогій
(г. Мінск, Беларусь)

*Даклад прысвечаны аналізу адлюстравання рэлігійнай праблематыкі ў ідэалогіі праўрадавага студэнцкага руху міжваеннай польскай дзяржавы, у склад якой уваходзіла Заходняя Беларусь. Характарызуюцца адносіны да рэлігіі і каталіцкай царквы такіх арганізацый, як Саюз польскай дэмакратычнай моладзі, Легіён маладых і Дзяржаўная думка, якія актыўна дзейнічалі і на тэрыторыі Віленскага ўніверсітэта.*

У міжваенны перыяд студэнцтвам польскай дзяржавы быў створаны цэлы шэраг саюзаў і аб’яднанняў. Іх дзейнасць распаўсюджвалася і на Віленскі ўніверсітэт імя С. Баторыя, адзіную ВНУ на тэрыторыі Заходняй Беларусі, якая ў той час знаходзілася пад польскай акупацыяй. Вядома, што ў 1937/38 навучальным годзе тут існавалі 73 такія арганізацыі [1, с. 174–177]. У той ці іншай ступені яны прадстаўлялі фактычна ўвесь палітычны спектр тагачаснай Польшчы. Некаторыя з іх мелі цесную сувязь з лагерам “санацыі”, які прыйшоў да ўлады ў выніку дзяржаўнага перавароту 1926 г. і імкнуўся прыцягнуць на свой бок у тым ліку студэнцтва і маладую інтэлігенцыю.

Найбольш вядомымі і ўплывовымі праўрадавымі студэнцкімі арганізацыямі міжваеннай Польшчы з'яўляліся Саюз польскай дэмакратычнай моладзі (СПДМ), Легіён маладых (ЛМ) і Дзяржаўная думка (ДД). Першыя два саюзы можна аднесці да левага крыла "санацыі", трэці знаходзіўся на правым флангу праўрадавага маладзёжнага руху. Гэта знайшло сваё адлюстраванне ў іх ідэйных дэкларацыях і дакументах, у якіх, у тым ліку, закраналася рэлігійная праблематыка і адносіны праўрадавага студэнцтва да рымска-каталіцкай царквы.

Створаны ў 1927 г. СПДМ, які заяўляў пра сябе, як аб'яднанне "перадавой і нацыянальна-дзяржаўніцкай інтэлігенцкай моладзі", выступаў з дастаткова антыклерыкальных пазіцый. Ідэолагі саюза аб'яўлялі рэлігію асабістай справай кожнага чалавека. На іх думку, яна заслугоўвала пашаны ў якасці "крыніцы ідэальных элементаў і этычнай нормы". СПДМ асуджаў рэлігійны пераслед і рэлігійную варожасць. Пры гэтым адзначалася, што вельмі часта рэлігія становіцца "зручным сродкам ажыццяўлення фактычнай улады над народнымі масамі" ў руках сацыяльнай рэакцыі і духавенства, якія кіруюцца сваімі матэрыяльнымі інтарэсамі і класавымі мэтамі ватыканскай палітыкі. Што тычыцца Польшчы, то тут рэлігія стала "сродкам палітычнай барацьбы ў руках кансерватыўнага, шляхецка-капіталістычна-клерыкальнага лагеру". Акрамя таго, калі рэлігійны культ ператвараецца ў камерцыйнае прадпрыемства, рэлігія ператвараецца пустой формулай ці забабонам для народных мас, а для духавенства – прадметам гандлю [2, с. 10].

СПДМ патрабаваў рэалізацыі прынцыпу свабоды сумлення праз увядзенне цывільных шлюбаў і адмену абавязковага вывучэння рэлігіі ў школах. Рэлігійныя аб'яднанні павінны былі самі фінансаваць сваё духавенства, што "значна паўплывае на паглыбленне маральнасці і ідэйнай пазіцыі". Таксама высоўвалася патрабаванне адмены канкардата Польшчы з Ватыканам па прычыне вялікіх выдаткаў з боку дзяржавы і грамадства. Прапаноўвалася ўвядзенне кантролю над сістэмай выхавання ў духоўных семінарыях і адхіленне духавенства ад удзелу ў палітыцы [2, с. 10].

Ідэалам жа маральнага, "наскрозь этычнага" чалавека публіцысты СПДМ аб'яўлялі таго, "хто дзейнічае добра, а не той, хто слепа слухае і бяздумна выконвае формулкі" [2, с. 10].

У лютым 1930 г. па ініцыятыве кіраўніцтва "санацыі" ўзнік Легіён маладых. Адзін з пунктаў яго "Ідэйнай дэкларацыі" гучаў наступным чынам: "Вызнаючы прынцып свабоды сумнення ў стварэнні новага тыпу польскага грамадзяніна, мы прызнаём вялікую этычную вартасць рэлігійнага фактару і таму з павагай ставімся да рэлігіі, як крыніцы ідэальных элементаў чалавечнасці" [3, с. 5].

Тым не менш, адносіны паміж ЛМ і каталіцкім касцёлам былі вельмі складанымі. У тым ліку гэта было звязана і з выхаваўчымі ідэямі арганізацыі. Так, яе галоўны камендант, З. Запасіевіч, сцвярджаў, што ЛМ "належным чынам ацэньвае значэнне для асобы прыватнай этыкі, якая вынікае з асобных рэлігійных сістэм і ў пэўнай, хоць і вельмі невялікай меры, рэгулюе яе адносіны да іншых асоб, але галоўны націск робіць на грамадскае выхаванне грамадзяніна" [4, с. 176]. Акрамя таго, Легіён выступаў супраць усіх міжнародных органаў, якія ставяць інтарэсы асобных класаў і груп над інтарэсамі дзяржавы. У першую чар-



Электронный архив ... Кулешова

гу, на думку лідара арганізацыі, палітыку, спрэчную з дзяржаўнымі інтарэсамі, праводзілі, Камінтэрн, капітал і касцёл.

Гэта выклікала абвінавачванні з боку каталіцкай іерархіі. У лютым 1934 г. кардынал А. Глонд, прымас Польшчы, нават заявіў, што ЛМ стаў на камуністычныя пазіцыі і “адмаўляе хрысціянства, змагаецца з царквой. Узводзіць паклёп на св. Сталіцу і каталіцкія арганізацыі… жадае падзелу і барацьбы дзяржавы з царквою. Калі гэтая антыкаталіцкая і камуністычная арыентацыя будзе захоўвацца ў перыёдыцы і дакладах, трэба будзе лічыць Легіён маладых аб’яднаннем, якое асуджаецца царквою згодна з кананічным правам” [5, с. 581].

Кіраўніцтва арганізацыі адпрэчвала такія абвінавачванні і тлумачыла іх няведаннем ідэалогіі Легіёна маладых. Яно падкрэслівала, што ЛМ выступаў і выступае не супраць прынцыпаў хрысціянства і каталіцкай царквы, як рэлігійнага інстытуту, а супраць палітычнай дзейнасці часткі духавенства, якая не адпавядае прынцыповым асновам польскіх дзяржаўных інтарэсаў. Такую пазіцыю, па меркаванню лідэраў ЛМ, ні ў якім разе нельга лічыць “супярэчнай прынцыпам хрысціянства” [6, с. 2].

Значна больш "клерыкальную" пазіцыю займала арганізацыя Дзяржаўная думка, якая ўзнікла ў 1927 г. пасля аб’яднання шэрагу невялікіх манархічных і кансерватыўных студэнцкіх саюзаў. Яе мэтай было абвешчана “стварэнне новага тыпу грамадзяніна Незалежнай Польшчы з высокім узроўнем характару, заснаваным на арыенцірах і этыцы каталіцкай рэлігіі і развітым пачуццём дзяржавы ў адпаведнасці з найвялікшымі польскімі вялікадзяржаўнымі традыцыямі” [7, с. 23].

Разважаючы над дырэктывамі польская вялікадзяржаўнай “рацыі стану”, ідэолагі ДМ лічылі, што маральнай асновай дзяржаўнага жыцця павінна быць толькі хрысціянская этыка, “паколькі польская дзяржава не можа быць пазаканфэсійнай дзяржавай, бо мы не верым у развіццё грамадстваў, якія б звязвалі свой лёс з рацыянальным светапоглядам”. Гарантаваць маральнае здароўе грамадства маглі толькі аддача прыярытэту каталіцкаму касцёлу пры поўнай талерантнасці да іншых канфесій, абсалютная павага да інстытуту сям’і, заснаванага на прынцыпах рэлігіі, і ўдзел касцёла ў выхаванні і адукацыі [7, с. 9].

Такім чынам, праўрадавы студэнцкі рух у міжваеннай польскай дзяржаве не з’яўляўся аднародным, аб чым, у тым ліку, сведчылі і розныя падыходы да рэлігійнай праблематыкі. Гэта, у сваю чаргу, зніжала эфектыўнасць “барацьбы за душы” студэнцкай моладзі.

## Літаратура


1. Skład Uniwersytetu w roku akademickim 1938/39 // Rocznik Uniwersytetu Stefana Batorego w Wilnie 1938 – 1939. – Wilno: Nakładem USB, 1939. – S. 123 – 180.
2. Dla Polski. 1886 – 1936. Z.M.P., O.M.N., Z.P.M.D. Informator. – Krakow: „Fortuna”, 1936. – 32 s.
3. Deklaracja ideowa Legionu Młodych – Związku Pracy dla Panstwa // Jednodniowka Legionu Młodych – Związku Pracy dla Panstwa. Obwod Brzesc nad Bugiem. – Brzesc nad Bugiem, 1933. – S. 4–5.
4. Czechowicz, J. Legion Młodych – Związek Pracy dla Panstwa / J. Czechowicz // Gimnazium. – 1934. – № 4 – 5. – S. 175 – 176.
5. Mysłek, W. Kosciół katolicki w Polsce w latach 1918 – 1939 / W. Mysłek. – Warszawa: Książka i Wiedza, 1966. – 670 s.
6. Oswiadczenie Komendy Głownej Legjonu Młodych // Na przełomie. – 1934. – № 1. – S. 2.
7. Mysl Mocarstwowa. Wytyczne ideowe i statut. – Warszawa: Drukarnia Mazowiecka, 1929. – 32 s.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова